Подрядными строительными организациями всех форм собственности в первом квартале выполнено подрядных работ собственными силами на 81,8 миллиарда рублей, или 94 процента к соответствующему периоду прошлого года, в том числе государственными организациями — на 46,2 миллиарда рублей, или 56 процентов общего объема работ, арендными — на 30,8 миллиарда рублей (38 процентов), строительными кооперативами-трестами — на 1,9 миллиарда рублей и коллективными предприятиями — на 1,6 миллиарда рублей (по 2 процента), акционерными обществами — на 720,6 миллиона рублей, организациями потребительской кооперации — на 460,2 миллиона рублей (по 1 проценту).

Транспорт и связь

Объем перевозок грузов транспортом общего пользования составил 73,9 миллиона тонн и уменьшился по сравнению с первым кварталом 1992 года на 34,8 процента, в том числе железнодорожным — на 27,2, автомобильным — на 36,8 процента.

В конце первого квартала на прирельсовых погрузочных местах предприятий и железнодорожных станций находилось 1,2 миллиона тонн подлежащей перевозке продукции, что на 44 процента больше, чем на конец первого квартала 1992 года, в их числе цемент, лесные и строительные грузы, химические и минеральные удобрения, черные металлы.

В связи с резким удорожанием стоимости проезда на воздушном и автомобильном транспорте, а также сокращением маршрутов пассажиропотоки переместились на более дешевый железнодорожный транспорт. Перевозки пассажиров железнодорожным транспортом возросли по сравнению с январем—мартом 1992 года на 59 процентов, авиационным — снизились в 2,8 раза, автомобильным — на 7 процентов.

Предприятиями связи общего пользования предоставлено населению услуг на 2,1 миллиарда рублей, их доходы составили 9,2 миллиарда рублей.

Внешнеэкономические связи

Внешнеторговый оборот за первый квартал 1993 года составил 361,8 миллиона долларов США, в том числе экспорт товаров — 180,7 миллиона долларов, услуг — 70 тысяч долларов, импорт товаров — 172,6, услуги — 8,4 миллиона долларов.

На свободно конвертируемую валюту экспортировано товаров на 91,2 миллиона долларов, или 50,5 процента от общего объема экспорта, по бартерным операциям — на 80,6 (44,6 процента), по коммерческому кредиту — на 8,5 миллиона долларов (4,7 процента).

По сравнению с первым кварталом 1992 года экспортные поставки тракторов сократились на 334 штуки, или на 13,2 процента, грузовых автомобилей — на 146 штук, или на 37,4 процента, холодильников — на 8,1 тысячи, или на 15 процентов, велосипедов (включая детские) — на 13,5 тысячи, или на 72,8 процента, телевизоров — на 13,1 тысячи, или на 56,1 процента, подшипников качения — на 201,6 тысячи, или на 50,5 процента.

В составе импорта доля машин, оборудования и транспортных средств составляет 29,8 процента, продукция химической промышленности — 6,5 процента, зерна и другой продукции растительного происхождения — 28,6 процента. Закуплено зерна на 40 миллионов долларов, сахара — на 13, муки — на 7, медикаментов — на 1,6, обуви кожаной — на 1,3 миллиона долларов, кофе натурального и какао-бобов — на 869 тысяч долларов.

Основными внешнеторговыми партнерами республики являются европейские страны, на долю которых приходится 78 процентов внешнеторгового оборота. Товарооборот с Германией за первый квартал составил 63,5 миллиона долларов, Польшей — 37,4, Австрией — 29,7, Великобританией — 23,3, Швейцарией — 20,8, Данией — 11,3, Италией — 10,4, Францией — 8,5, Нидерландами — 7,3 миллиона долларов. Развиваются торговые отношения с другими странами. Внешнеторговый оборот с США составил 29,7 миллиона долларов, Турцией — 10,5, Китаем — 13,1, Тайванем — 9, Индией — 3,2 миллиона долларов США.

Совместными предприятиями произведено продукции и оказано услуг на 15,6 миллиарда рублей, экспортировано товаров и услуг на 4,6 миллиона долларов США, импортировано изделий и сырья на 13,2 миллиона долларов, реализовано товаров и услуг на внутреннем рынке за валюту на 4 миллиона долларов, за рубли — на 12,5 миллиарда.

Трудовые ресурсы и занятость населения

Трудовые ресурсы республики составили 6 миллионов человек, или 58 процентов общей численности населения. В народном хозяйстве занято 4,9 миллиона человек. Продолжается процесс формирования новых рыночных структур, что сопровождается перераспределением рабочей силы между секторами экономики. На государственных предприятиях и в организациях работает 66 процентов общей численности занятых в народном хозяйстве против 71 процента в первом квартале прошлого года. На начало апреля количество зарегистрированных новых хозяйственных формирований достигло 31 тысячи. Среди них 23 тысячи малых предприятий и обществ с ограниченной ответственностью, 4 тысячи кооперативов, свыше тысячи арендных предприятий, 779 совместных, 150 акционерных обществ, 2421 фермерское (крестьянское) хозяйство. В этих структурах занято 16 процентов общей численности работающих.

На начало апреля в службе занятости состояло на учете 52,4 тысячи безработных. На эту дату прошлого года их было 4,2 тысячи. В течение квартала трудоустроено 18,9 тысячи человек, или 32 процента от числа обратившихся. Пособие по безработице получают 27,3 тысячи человек, или 52 процента общего числа безработных. На социальную поддержку граждан, нуждающихся в трудоустройстве, в первом квартале было израсходовано 253,7 миллиона рублей. Это пособие по безработице, материальная помощь, затраты на переобучение и организацию общественных работ. В общей численности занятого населения безработные составляют 1 процент.

Правонарушения

В первом квартале 1993 года в республике зарегистрировано 24 тысячи преступлений, что на 1,4 процента больше, чем в первом квартале 1992 года. В Гродненской области преступность увеличилась на 13 процентов, Брестской — на 7, Могилевской — на 6, в г.Минске — на 5, Минской области — на 2 процента. В Гомельской области она уменьшилась на 3 процента, в Витебской — на 0,1 процента.

По сравнению с первым кварталом 1992 года увеличилось число тяжких преступлений. За три месяца текущего года их зарегистрировано 3759, или на 11 процентов больше. Совершено 506 умышленных тяжких телесных повреждений, что на 42 процента больше, чем за соответствующий период прошлого года, 1237 грабежей (на 8 процентов), 185 умышленных убийств (на 46 процентов), 19 покушений на убийство, или на 8 покушений больше, чем за этот период прошлого года. Зарегистрировано 224 разбойных нападений, или на 59 процентов больше, чем за первый квартал 1992 года.

Зарегистрировано 5348 краж государственного и общественного имущества — на 11 процентов меньше по сравнению с соответствующим периодом прошлого года. В 1,5 раза возросло число краж с баз, магазинов и других торговых точек. Уменьшилось число зарегистрированных краж личного имущества граждан. Их зарегистрировано 7922, что на 9 процентов меньше, чем в январе—марте 1992 года. Число краж из квартир по-прежнему растет. Их зарегистрировано 3078, или на 5 процентов больше.

В числе раскрытых преступлений каждое четвертое — групповое, каждое третье — совершено в состоянии алкогольного опьянения, седьмое — несовершеннолетними или при их соучастии, четвертое — ранее совершившими преступления.

Правоохранительными органами выявлено 12,6 тысячи человек совершивших преступления (за первый квартал 1992 года — 10,9 тысячи). К уголовной ответственности привлечено 10,8 тысячи правонарушителей. Каждый четвертый из них не работал и не учился.

❑

Население республики по состоянию на 1 апреля 1993 года составило 10,3 миллиона человек.

Государственный Комитет Республики Беларусь по статистике и анализу.

Мы і свет

Іх цікавіць, на што здольная наша "абаронка"

Прадстаўнікі прыватных фірм і дзяржаўных прадпрыемстваў ЗША, Францыі, Латвіі і Бангладэш наведаюць выстаўку "Абаронная прамысловасць і канверсія-93", якая ў канцы мая пройдзе ў Мінску.

Аб гэтым дзелавыя колы Еўропы, Азіі і Амерыкі паведамілі яе аргкамітэту. Як расказаў кіраўнік рабочай групы аргкамітэта Алег Кураў, іх цікавяць навукаёмістыя тэхналогіі, навуковыя распрацоўкі спецыяльнага прызначэння, ваенная тэхніка і маёмасць, выпускаемая ў Беларусі.

З рэспублік Садружнасці ўдзельнікамі пажадалі стаць прадстаўнікі "абаронкі" Расіі, Украіны і Казахстана.

Члены арганізацыйнага камітэта спадзяюцца, што да пачатку выстаўкі спіс гасцей, удзельнікаў і спонсараў мерапрыемства стане намнога даўжэйшым.

Белінфарм.

В двух словах

Десант вынужден "стрелять". Горючее

Командиры витебских десантников опровергли высказанную 20 апреля в "Красной звезде" мысль об ослаблении своих рядов после отъезда из Беларуси офицеров с фронтовым опытом.

Ключевые должности в дивизии и сейчас занимают бывшие афганцы, а объем и результаты боевой учебы превосходят показатели многих аналогичных воинских частей России. Тревогу вызывает лишь нужда в горючем. На днях, например, участников проверочных стрельб, возвращавшихся с полигона, пришлось высадить из машины... в 15 км от Витебска. Если топливное "голодание" распространится еще и на авиацию, то "летающая пехота" может-таки превратиться в классическую "царицу полей".

Сергей БУТКЕВИЧ.

Будем дружить министерствами

В парламенте Республики Молдова состоялась церемония подписания соглашения о сотрудничестве между министерствами внутренних дел Беларуси и Молдовы.

Соглашение предусматривает взаимодействие в борьбе с бандитизмом, терроризмом и международной преступностью, с незаконными операциями с оружием, ядовитыми и радиоактивными материалами, с изготовлением и сбытом поддельных денег и документов, с распространением наркотических веществ и т.д.

Сергей ВЕРАС.

Брызге — шампанское!

Вчера исполнилось 50 лет Лидии Дмитриевне Брызге — самой титулованной доярке Брестчины.

Более регалий красноречив факт: сегодня трудовые показатели юбиляра соответствуют удоям 12-ти "среднестатистических" доярок, а всего за три десятка трудовых лет Лидия Дмитриевна надоила молока 12 556 автоцистерн.

Василий САРЫЧЕВ.

Возродись, святое место!

Одним из оазисов православной культуры обещает вновь стать родина первого белорусского букваря Кутеинская лавра.

Основана она более трех веков назад в окрестностях Орши и частично сохранилась до наших дней. Здесь начались богослужения в восстановленной церкви Святой Троицы, пострижены в монашество новые послушники. Посетивший лавру митрополит Филарет передал схимникам уникальный образок Богоматери, призванный оберегать святое место.

Кутеинский монастырь был в свое время средоточием ученого богословия, хранилищем богатой библиотеки, центром духовного и светского книгопечатания, художественной ковки и резьбы. С возрождением обители церковь связывает надежду на продолжение этих традиций.

Сергей СЕРГЕЕВ.

Страна старых холостяков?

Не встретит ли Беларусь новый век в качестве страны холостяков, к тому же немолодых?

В Витебской области, например, за первый квартал нынешнего года умерло 5432 человека, а родилось всего 3800. Да и откуда взяться приросту населения, если на каждые два брака приходится сейчас почти 1,5 развода?

Сергей ДВИНСКИЙ.

Канцэпцыя развіцця інфармацыйнай прасторы Рэспублікі Беларусь

Праект

Часовы творчы калектыў, створаны Міністэрствам інфармацыі Беларусі, падрыхтаваў і прапануе для шырокага абмеркавання праект Канцэпцыі развіцця інфармацыйнай прасторы Рэспублікі Беларусь.

Праект канцэпцыі разгледжаны на пасяджэнні калегіі Мініфарма з удзелам прадстаўнікоў шэрагу дзяржаўных і недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Многія з выказаных на калегіі заўваг улічаны, аднак праца над канцэпцыяй працягваецца.

У сувязі з тым, што праблемы інфармацыйнага забеспячэння грамадства маюць выключна важнае значэнне для ўмацавання дзяржаўнага суверэнітэту і нацыянальна-культурнага адраджэння, просім журналістаў, юрыстаў, навукоўцаў, усіх зацікаўленых выказаць сваё меркаванне.

Заўвагі і прапановы па праекту канцэпцыі можна накіроўваць да 1 чэрвеня 1993 года на адрас: 220617, г. Мінск, праспект Машэрава, 11, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Уводзіны

Рэспубліка Беларусь набыла незалежнасць, стала суверэннай дзяржавай. Складваецца новая грамадска-гістарычная сітуацыя, фарміруюцца новыя вытворчыя адносіны, адраджаецца нацыянальная культура. Пачаўся працэс інтэграцыі Беларусі ў сусветную супольнасць.

Інфармацыйная прастора Беларусі павінна адпавядаць гэтым карэнным зменам, развівацца з улікам сённяшніх знешнепалітычных сацыяльна-эканамічных рэалій і гістарычнай перспектывы, прычым развівацца па сваіх унутраных законах. Па сутнасці, стаіць задача стварэння самастойнай інфармацыйнай сістэмы, накіраванай на забеспячэнне нацыянальных інтарэсаў, рэальнай свабоды слова і друку.

Да абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту на тэрыторыі рэспублікі функцыяніравала падсістэма, васальная частка агульнай сістэмы сродкаў масавай інфармацыі Савецкага Саюза. Таму ўзнікла аб'ектыўная неабходнасць распрацоўкі мадэлі адзінай інфармацыйнай прасторы і канцэпцыі функцыяніравання сродкаў масавай інфармацыі (СМІ) Рэспублікі Беларусь, прававой рэгламентацыі ў гэтай сферы.

Друк, тэлебачанне, радыё, іншыя сродкі масавай інфармацыі адыгрываюць выключна важную ролю ва ўзбагачэнні інтэлекту нацыі, фарміраванні грамадскай думкі, умацаванні дэмакратыі, права, маралі, забеспячэнні насельніцтва аператыўнай і аб'ектыўнай інфармацыі аб стане і развіцці матэрыяльна-вытворчай, культурнай і сацыяльна-бытавой сфер, аб палітычным жыцці.

У аснове канцэпцыі ляжыць ідэя свабоды сродкаў масавай інфармацыі як адной з галоўных гарантый свабоды чалавека, дэмакратычнага развіцця грамадства. Менавіта ў такім кантэксце ідэя свабоды зафіксавана ва "Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека": "Кожны чалавек мае права на свабоду перакананняў і на свабоднае выказванне іх..."

Сістэма СМІ Рэспублікі Беларусь не павінна быць ізаляванай. Партнёрскі абмен інфармацыяй з замежжам па розных камунікатыўных каналах — адна з умоў нармальнага яе функцыяніравання.

Дзяржаўная палітыка ў галіне масавай інфармацыі

Дзяржава зацікаўлена ў развіцці сродкаў масавай інфармацыі і стварае неабходныя ўмовы для іх дзейнасці. Яна разглядае сістэму СМІ як важную састаўную частку беларускай нацыянальнай культуры і садзейнічае ўмацаванню творчай, эканамічнай і фінансавай самастойнасці друку, тэлебачання і радыё.

Цэнзура, палітычны, эканамічны і адміністрацыйны дыктат над сродкамі масавай інфармацыі не дапускаюцца. Галоўныя напрамкі патоку інфармацыі вызначаюцца прыярытэтамі ў дзяржаўнай палітыцы, эканоміцы, культуры, навуцы. Заказ на інфармацыю аб дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання не з'яўляецца падставай для ўмяшання заканадаўчай і выканаўчай улады ў дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі.

Дзяржаўнае рэгуляванне дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі ажыццяўляецца праз Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, у сістэму якога ўваходзяць Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Беларусі, Беларускае інфармацыйнае агенцтва, Інспекцыя па ахове дзяржаўных тайн у сродках масавай інфармацыі, а таксама па асобных напрамках праз упраўленні інфармацыі аблвыканкамаў.

Для забеспячэння дзяржаўных гарантый свабоднага функцыяніравання друку, радыё і тэлебачання, падтрымкі і кантактнасці паміж інфармацыйнымі і ўладнымі структурамі ствараецца Грамадска-дзяржаўны савет па сродках масавай інфармацыі, у які ўваходзяць журналісты і юрысты, навукоўцы, прадстаўнікі Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, органаў дзяржаўнага кіравання СМІ.

Ахова дзяржаўных тайн у сродках масавай інфармацыі забяспечваецца ў адпаведнасці з дзеючымі заканадаўчымі і нарматыўнымі актамі.

Дзяржава гарантуе сацыяльную абарону ўсіх работнікаў сродкаў масавай інфармацыі, што адлюстроўваецца ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь.

Прававое забеспячэнне дзейнасці СМІ

Рэспубліка Беларусь як член ААН і іншых аўтарытэтных міжнародных арганізацый уваходзіць у сусветную інфармацыйную прастору, прытрымліваючыся прагрэсіўных прававых норм і рэкамендацыі выпрацаваных міжнародным супольніцтвам.

Асноўным дакументам, які адлюстроўвае прынцыпы няспыннага і бесперашкоднага руху інфармацыі ў межах асобных краін і паміж краінамі, з'яўляецца "Хартыя свабоды друку". Рэспубліка Беларусь далучаецца да Хартыі і ў сваёй палітыцы адносна сродкаў масавай інфармацыі кіруецца зафіксаванымі ў ёй прынцыпамі, прызнаючы, што свабода СМІ забяспечвае свабоду народа.

Міжнародныя прынцыпы функцыяніравання СМІ, а таксама нацыянальная спецыфіка развіцця інфармацыйнай сферы зацвярджаюцца наступнымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь: Законам аб друку, Законам аб тэлебачанні і радыё, Законам аб выдавецкай дзейнасці, іншымі нарматыўнымі актамі.

Законы рэгламентуюць дзейнасць усіх відаў друкаваных выданняў, тэле-, радыёпраграм і выдавецтваў незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці і форм уласнасці, забяспечваюць прававое рэгуляванне функцыяніравання СМІ, свабоду слова і друку, ажыццяўленне прынцыпу галоснасці, гарантуюць грамадзянам Рэспублікі Беларусь права на атрыманне поўнай і аб'ектыўнай інфармацыі і асабісты ўдзел у інфармацыйным працэсе. У законах фіксуюцца правы і абавязкі журналістаў, меры па іх прававой і сацыяльнай абароне.

Законы аб сродках масавай інфармацыі грунтуюцца на фундаментальнай аснове беларускай нацыянальнай культуры, з улікам задач умацавання дзяржаўнага суверэнітэту і нацыянальнага адраджэння, асаблівасцей шматнацыянальнай супольнасці насельніцтва рэспублікі.

У законе аб выдавецкай дзейнасці прадугледжваецца стварэнне на базе газетна-часопісных выдавецтваў акцыянерных таварыстваў, у якія, акрамя выдаўцоў і паліграфістаў, могуць уваходзіць рэдакцыі перыядычных выданняў.

Сістэма сродкаў масавай інфармацыі Беларусі

У сістэму СМІ Рэспублікі Беларусь уваходзяць: інфармацыйныя агенцтвы; дзяржаўныя, ведамасныя, прыватныя газеты, часопісы і выданні часопіснага тыпу, аналагічныя выданні палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, рэлігійных арганізацый і нацыянальных меншасцей; усе віды тэлебачання і радыё; газетна-часопісныя выдавецтвы; прэс-службы.

Інфармацыйная прастора забяспечваецца сумеснымі намаганнямі ўсіх СМІ рэспубліканскага, абласнога, раённага і нерэгіянальнага ўзроўняў. Галоўная агульная мэта журналісцкага супольніцтва: аператыўна і як мага больш поўна і якасна задавальняць інфармацыйныя патрэбы насельніцтва Беларусі і іншых краін, рэалізоўваць права кожнага грамадзяніна на аператыўнае атрыманне дакладных звестак аб дзейнасці дзяржаўных органаў і арганізацый грамадскіх аб'яднанняў і службовых асоб, аб усіх аспектах жыцця рэспублікі і замежных дзяржаў.

1. Інфармацыйныя агенцтвы

Інфармацыйныя агенцтвы ў Беларусі, маючы ўсе магчымасці свабодна ўзнікаць і функцыяніраваць, робяць інфармацыйную прастору ўсё больш насычанай і шматграннай. Канкурэнтная барацьба паміж імі за авалоданне аўдыторыяй спрыяе фарміраванню багатага інфармацыйнага рынку.

Падтрымліваючы інфармацыйныя агенцтвы, улады Рэспублікі Беларусь гарантуюць ім:

— свабодны доступ да афіцыйных матэрыялаў і іншых крыніц інфармацыі;

— права свабодна выказваць розныя, у тым ліку альтэрнатыўныя афіцыйным, меркаванні па праблемах палітыкі, эканомікі, нацыянальна-культурнага адраджэння, якія адпавядаюць прынцыпам плюралізму і дэмакратычнага развіцця грамадства;

— адсутнасць юрыдычных, тэхнічных і тарыфных правілаў, якія стрымліваюць паток інфармацыі;

— недапушчэнне манаполіі аднаго з агенцтваў на інфармацыю.

Абвяшчэнне суверэнітэту Беларусі, яе самастойны выхад на міжнародную арэну, узнікненне шматлікіх партый і грамадскіх рухаў скіроўваюць дзейнасць інфармацыйных агенцтваў, як спецыфічнага звяна СМІ, у рэчышча агульнадзяржаўных інтарэсаў улады, стымулююць тыя агенцтвы, якія кіруюцца прынцыпамі;

— недапушчэння тэндэнцыйнасці, знарочыста агітацыйна-прапагандысцкай накіраванасці сваіх паведамленняў;

— максімальна магчымай дэпалітызацыі тэкстаў;

— канструктывізму, недапушчэння выказванняў, якія падбухторваюць насельніцтва на супрацьзаконныя дзеянні, на канфрантацыю.

Дзяржава абараняе агенцтвы ад палітычнага і эканамічнага дыктату, манапольнага ўціску. Незалежнасць агенцтваў яна гарантуе:

- спрыяльным падаткаабкладаннем і інвесціраваннем;
- удзелам у развіцці іх матэрыяльна-тэхнічнай базы;
- заахвочваннем імкнення да фінансавай самастойнасці.

Асаблівая ўвага звяртаецца на забеспячэнне ўсебаковай незалежнасці Белінфарма як нацыянальнага дзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва, на поўнае пазбаўленне яго ад дыктату палітычных, грамадскіх арганізацый і ведамстваў. Вось чаму ўлады імкнуцца:

- стварыць Белінфарму рэжым найбольшага спрыяння ў галіне падаткаабкладання, дзяржаўнага субсідзіравання і крэдытавання;

- садзейнічаць, каб у бліжэйшыя 2—3 гады былі адкрыты замежныя карэспандэнцкія пункты Белінфарма з мэтай ліквідацыі манаполіі ІТАР—ТАСС на пастаўку ў Беларусь інфармацыі з іншых краін.

Беларусь адкрыта для замежных інфармацыйных агенцтваў, што садзейнічае яе інтэграцыі ў міжнародную інфармацыйную прастору. Пры гэтым дзяржава імкнецца, каб:

- абмен інфармацыяй з замежжам вёўся на парытэтнай або збалансаванай аснове;

- дзейнасць замежных інфармацыйных агенцтваў або іх службаў не падлягала ніякім відам цэнзуры і рэгулявалася толькі агульнапрызнанымі міжнародна-прававымі нормамі і законамі Беларусі.

2. Перыядычны друк

Асноўную тэндэнцыю развіцця перыядычнага друку вызначае свабода стварэння выданняў. Побач з дзяржаўнымі органамі заснавальнікамі газет і часопісаў выступаюць недзяржаўныя арганізацыі, прыватныя асобы, калектывы рэдакцый, палітычныя партыі і рухі, грамадскія і рэлігійныя аб'яднанні. Такім чынам узрастае плюралістычны патэнцыял прэсы, усё больш поўна задавальняюцца інфармацыйныя патрэбы насельніцтва Беларусі.

Развіваючы гэты пазітыўны накірунак, дзяржава абараняе прэсу ад жорсткага прэсінгу рынычных адносін з мэтай забеспячэння яе эканамічнай і палітычнай незалежнасці, без чаго немагчыма свабода друку. Улады гарантуюць перыядычным выданням:

- рэжым найбольшага спрыяння ў падаткаабкладанні і інвесціраванні;

- садзейнічанне ўмацаванню фінансава-гаспадарчай самастойнасці, развіццю розных відаў камерцыйнай дзейнасці;

- падтрымку новых арганізацыйна-творчых структур.

Пры гэтым прыярытэтная ўвага надаецца беларускамоўнаму, дзіцячаму, мясцоваму друку, які ва ўмовах рыначнай эканомікі апынуўся ў асабліва цяжкім становішчы.

У перыядычным друку паглыбляюцца працэсы дыферэнцыяцыі і размежавання функцый, узмацняецца канкурэнцыя. З другога боку, узрастае актуальнасць яго кансалідацыі, аб'яднання намаганняў дзеля патрэб грамадства. З улікам гэтага прыярытэт у дзяржаўнай падтрымцы атрымліваюць тыя выданні, якія:

- асвятляюць актуальныя грамадска-палітычныя, сацыяльныя, эканамічныя і навукова-тэхнічныя праблемы з пазіцый дзяржаўных інтарэсаў;

- трымаюць курс на ўмацаванне згоды ў грамадстве, не дапускаюць экстрэмісцкіх публікацый, выказванняў, якія прыніжаюць гонар і годнасць чалавека, наносяць шкоду духоўнаму і маральнаму здароўю народа;

- пастаянную ўвагу ўдзяляюць ходу пераадолення вынікаў чарнобыльскай катастрофы.

Вядучай тэмай для прэсы становіцца сацыяльна-эканамічнае абнаўленне і нацыянальна-культурнае адраджэнне Беларусі, умацаванне статуса беларускай мовы як дзяржаўнай. Пры гэтым, з улікам рэалій моўнай сітуацыі, якая склалася ў рэспубліцы пад уплывам канкрэтных грамадска-гістарычных умоў, не абмяжоўваецца імкненне розных груп насельніцтва, нацыянальных меншасцей да атрымання інфармацыі на іншых мовах. Заахвочваюцца намаганні двухмоўных газет і часопісаў, якія робяць выбар на карысць беларускай мовы.

Для актыўнай інтэграцыі ў сусветную інфармацыйную прастору, давядзення да міжнароднага супольніцтва праўдзівых звестак аб Беларусі стымулюецца развіццё выданняў на беларускай і замежных мовах для распаўсюджання іх у іншых краінах. У сваю чаргу ўлады гарантуюць бесперашкоднае і шырокае азнаямленне насельніцтва рэспублікі з замежнымі выданнямі, ствараюць належныя ўмовы замежным партнёрам, дзейнасць якіх не пярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

Для прапаганды прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь у свеце ўводзіцца безліцэнзійны абмен выданнямі і праграмамі з арганізацыямі і фірмамі краін СНД і іншых замежных краін.

3. Тэлебачанне і радыё

Тэлебачанне і радыё як надзвычай эфектыўнаму па эмацыянальным уздзеянні і тэрытарыяльным ахопе сродку масавай інфармацыі дзяржава надае асаблівую ўвагу. Яна ўсебакова садзейнічае як станаўленню Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі, так і ўзнікненню і развіццю ў Беларусі іншых тэле- і радыёстанцый, каналаў, і праграм. У гэтых мэтах:

- з улікам станоўчага вопыту вядучых краін свету для забеспячэння дзяржаўных гарантый свабоднай дзейнасці тэлебачання і радыё ўтвараецца Каардынацыйны савет па тэлевізійнаму і радыёвяшчанню, які складаецца з прадстаўнікоў дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, вызначаных урадам і зацверджаных парламентам;

- уводзіцца сістэма спрыяльнага падаткаабкладання і інвесціравання тэлебачання і радыё;

- стымулюецца дзейнасць тэлебачання і радыё, накіраваная на забеспячэнне іх эканамічнай незалежнасці.

Не прэтэндуючы на манапалізацыю інфармацыйнай тэле- і радыёпрасторы, парламент і ўрад тым не менш першаступеннае значэнне надаюць пашырэнню магчымасцей Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі, паколькі гэта абумоўлена інтарэсамі дзяржавы і нацыі. Улады забяспечваюць:

- фінансаванне праграм матэрыяльна-тэхнічнага развіцця Белтэлерадыёкампаніі, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў;

- увядзенне абанентнай платы за карыстанне тэлепрыёмнікамі;

- права выкарыстання Белтэлерадыёкампаніяй другога тэлевізійнага і часткова другога радыёканала як камерцыйных;

- падпарадкаванне тэлерадыёкампаніі мясцовага тэлерадыёвяшчання ў абласных, буйных гарадах і раёнах, забеспячэнне яго тэхнічнага развіцця з дапамогай яе інвестыцыйнага фонду;

— пераўтварэнне тэлерадыёкампаніі шляхам натуральнага развіцця ў дзве самастойныя кампаніі — тэле- і радыё;

- адкрыццё тэлепраграмы на Мінск і Мінскую вобласць;

- будаўніцтва канцэртнай студыі і Дома радыё.

Паглыбляецца інтэграцыя беларускай інфармацыйнай тэле- і радыёпрасторы ў сусветную. Белтэлерадыёкампанія з дапамогай дзяржавы мэтанакіравана забяспечвае:

- пераход у бліжэйшыя гады з сістэмы SECAM у сістэму PAL, у якой працуе большасць тэлекампаній свету;

- адкрыццё ўласных карэспандэнцкіх пунктаў за мяжой, першапачаткова ў краінах Балтыі, Расіі, на Украіне, ва Узбекістане, Польшчы, Балгарыі, Чэхіі, Славакіі, Германіі;

- актыўны ўдзел у Еўрабачанні на правах яго паўнамоцнага члена, а таксама далучэнне да міжнародных дагавораў і пагадненняў, якія рэгулююць узаемаадносіны паміж сусветнымі тэлерадыёкампаніямі і саюзамі.

❑ ❑ ❑

Сістэма СМІ дзейнічае актыўна пры паслядоўным развіцці інтэграцыйных працэсаў. Паміж інфармацыйнымі агенцтвамі, выданнямі розных тыпаў, праграмамі тэле- і радыёвяшчання ўсталёўваюцца ўзаемасувязі, якія забяспечваюць інтэграцыю іх дзейнасці, захоўваючы спецыфіку і накіраванасць кожнага самастойнага выдання і праграмы. У інфармацыйнай прасторы яны займаюць адпаведную нішу.

Узаемадзеянне ў межах сістэмы ажыццяўляецца праз супрацоўніцтва "па вертыкалі" — паміж выданнямі і праграмамі рознага рэгіянальнага ўзроўню (рэспубліканскімі, абласнымі, раённымі) і "па гарызанталі" — паміж выданнямі і праграмамі асобна рэспубліканскага і абласнога ўзроўняў.

Зладжанай, эфектыўнай дзейнасці сістэмы СМІ садзейнічае творчая грамадская арганізацыя — Саюз журналістаў Беларусі, які функцыяніруе згодна са сваім статутам, ажыццяўляе сацыяльную абарону журналістаў, займаецца ўдасканаленнем іх прафесійнага майстэрства, пытаннямі журналісцкай этыкі, вядзе работу па згуртаванню журналісцкага корпуса.

Камунікатыўныя каналы абмену інфармацыяй

У Беларусі забяспечваецца свабода перамяшчэння інфармацыі. Ажыццяўляецца бесперашкодны абмен інфармацыяй як унутры рэспублікі, так і праз яе граніцы. Пры гэтым СМІ могуць свабодна абменьвацца матэрыяламі з дзяржаўнымі і прыватнымі інфармацыйнымі службамі, у тым ліку замежнымі.

Дзяржава спрыяе абнаўленню існуючых тэхнічна, тэхналагічна і маральна састарэлых камунікатыўных каналаў абмену інфармацыяй, якія не ў стане ў поўнай меры задаволіць патрэбы СМІ. З гэтай мэтай вядзецца замена тэлетайпнай, тэлефоннай, радыё- і паштовай сувязі, якая ў асноўным злучае паміж сабой Белінфарм і іншыя інфармацыйныя агенцтвы з вытворцамі і спажыўцамі інфармацыі, у тым ліку і за мяжой, на сучасныя камп'ютэрныя сеткі. Да іх далучаюцца раённыя і нерэгіянальныя СМІ. Усім СМІ прадастаўляецца магчымасць абменьвацца інфармацыяй без староннняй дапамогі.

Такім чынам фарміруецца адзіная сістэма камунікатыўных каналаў абмену інфармацыяй, якая надзейна злучыць інфармацыйную прастору Беларусі з міжнароднай інфармацыйнай прасторай. Дзейнасць гэтай сістэмы забяспечаць:

- стварэнне намаганнямі ўлад і СМІ адзінага інфармацыйнага камп'ютэрнага цэнтра з вялікім аб'ёмам электроннай памяці, банкам даных якога на аднолькавых умовах змогуць карыстацца ўсе СМІ;

- аснашчэнне СМІ сучаснай мадэмнай камп'ютэрнай сувяззю з усімі асноўнымі вытворцамі і спажыўцамі інфармацыі;

- пераход пры абмене інфармацыяй да спадарожнікавай сувязі і, адпаведна, адмаўленне ад дарагіх тэлеграфных каналаў, што зробіць СМІ незалежнымі ад манаполіі Міністэрства сувязі і інфарматыкі на гэтыя каналы і тарыфы.

Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне і фінансаванне сродкаў масавай інфармацыі

Эфектыўная дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі магчыма толькі пры належнай матэрыяльна-тэхнічнай базе.

Для ліквідацыі ў СМІ дэфіцыту на вытворчыя плошчы, сучаснае тэхнічнае і тэхналагічнае абсталяванне, матэрыялы, мэблю, даведачную літаратуру і г.д., з улікам пераходу да рыначнай эканомікі, забяспечваюцца:

- адыход ад уніфікаваных, стэрэатыпных прынцыпаў размеркавання рэсурсаў, укараненне прагрэсіўных дыферэнцыраваных нарматываў будаўніцтва і матэрыяльна-тэхнічнага аснашчэння аб'ектаў падрыхтоўкі і распаўсюджвання масавай інфармацыі;

- захоўванне дзяржаўнага заказу і дзяржаўных паставак сродкам масавай інфармацыі важнейшых матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў.

Пры гэтым улічваецца спецыфіка функцыянальнага прызначэння аб'екта СМІ.

Для стварэння найбольш спрыяльных умоў фарміравання адзінай інфармацыйнай прасторы цэнтралізуюцца асноўныя аб'екты распаўсюджвання інфармацыі. З гэтай мэтай:

- усе тэлерадыёперадатчыкі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь і пабудаваны за кошт дзяржаўных капітальных укладанняў, перадаюцца ў распараджэнне Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі для трансляцыі дзяржаўных праграм;

- падпарадкаванне Міністэрству інфармацыі перадаецца выдавецтва "Беларускі дом друку" для забеспячэння зладжанай і эфектыўнай дзейнасці выдавецка-паліграфічнага комплексу па выпуску перыядычных выданняў.

Для ліквідацыі манаполіі "Беларускага дома друку", аб'яднанага прадпрыемства "Мінская пошта", прадпрыемстваў "Белсаюздрук" у адпаведных галінах дзейнасці прымаецца ўрадавае рашэнне аб рэгуляванні іх матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў і эканамічных паказчыкаў.

Ва ўмовах пераходу да рыначных адносін, калі дзяржава не ў стане забяспечыць матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі ўсе патрэбы сродкаў масавай інфармацыі, неабходна арыентацыя іх на прамыя камерцыйныя кантакты з вытворцамі неабходнай прадукцыі. Для забеспячэння гэтых кантактаў пры Міністэрстве інфармацыі ствараецца камп'ютэрны цэнтр з электроннай базай звестак аб вытворцах пэўнай прадукцыі ў Беларусі і за яе межамі.

Асноўнымі крыніцамі фінансавання сродкаў масавай інфармацыі становяцца даходы ад камерцыйнай дзейнасці (рэклама; аказанне платных паслуг насельніцтву, прадпрыемствам і арганізацыям; рэалізацыя творчай прадукцыі), спонсарства, паступленні ад дабрачынных арганізацый, заробкі ад продажу ліцэнзій, укаранення новых тэхналогій, прыбыткі з іншых крыніц, якія не забаронены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Стымулюецца стварэнне сродкамі масавай інфармацыі творча-вытворчых аб'яднанняў, малых прадпрыемстваў, укараненне розных відаў вытворча-камерцыйнай дзейнасці, у тым ліку акцыянерных паліграфічных таварыстваў, куды на паях уваходзяць рэдакцыі газет і часопісаў, а таксама арганізацыя акцыянернымі таварыствамі ўласных службаў распаўсюджвання друку.

Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Беларусі фінансуецца ў першую чаргу за кошт абанементнай платы. Для газет і часопісаў асноўнымі сродкамі фінансавання становяцца паступленні ад заснавальнікаў, даходы ад падпіскі і рэалізацыі іх у розніцу.

Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі актыўна фарміруюць нацыянальную свядомасць і культуру грамадства, таму часткова фінансуюцца і за кошт дзяржаўнага бюджэту. У гэтым плане выключна важнае месца ва ўмовах нацыянальнага адраджэння займаюць беларускамоўныя выданні, а таксама дзіцячы друк, для якіх на пераходны перыяд забяспечваецца кампенсацыя страт ад іх выпуску і распаўсюджвання.

У мэтах стварэння спрыяльных умоў для фарміравання інфармацыйнай прасторы Беларусі захоўваецца частковае бюджэтнае фінансаванне тых перыядычных выданняў, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца Саветы народных дэпутатаў і органы дзяржаўнага кіравання.

Бюджэтнае фінансаванне ажыццяўляецца па нарматывах у залежнасці ад катэгорыі сродку масавай інфармацыі. Пры фактычным выдзяленні сродкаў улічваецца ўзровень інфляцыі, а кампенсацыя мае апераджальны характар.

Падрыхтоўка кадраў і навуковае забеспячэнне функцыяніравання сістэмы СМІ

Падрыхтоўка журналісцкіх кадраў у Рэспубліцы Беларусь пераводзіцца на нацыянальную аснову і карэнным чынам рэарганізуецца. Навучанне творчых работнікаў для СМІ ажыццяўляецца па спецыялізацыях: рэпарцёры, тэлерадыёрэпарцёры, фотарэпарцёры, работнікі сакратарыята, аглядальнікі, каментатары, журналісты-міжнароднікі, карэспандэнты шырокага профілю, выдавецкія рэдактары і інш. Уводзіцца і жанравая спецыялізацыя з улікам авалодання майстэрствам нарысіста, эсэіста, фельетаніста, літаратурна-мастацкага крытыка, інтэрв'юэра-аналітыка і г.д.

Факультэт журналістыкі БДУ, не з'яўляючыся самастойнай навучальнай установай, з такой задачай справіцца не можа. Таму на яго базе ствараецца Інстытут журналістыкі Рэспублікі Беларусь.

Прафесійная адукацыя ў Інстытуце журналістыкі вядзецца ў двух узроўнях: няпоўная вышэйшая адукацыя і вышэйшая адукацыя.

Структурнымі падраздзяленнямі Інстытута журналістыкі становяцца чатыры факультэты: 1. **Рэпарцёрскі** — з трохгадовым тэрмінам навучання (няпоўная вышэйшая журналісцкая адукацыя, два аддзяленні — газетна-часопіснае і радыётэлевізійнае); 2. **Аналітычнай журналістыкі** (пяцігадовы тэрмін навучання; два аддзяленні — газетна-часопіснае і радыётэлевізійнае); 3. **Завочны** (на завочным факультэце могуць працягваць вучобу выпускнікі рэпарцёрскага факультэта); 4. **Факультэт прафесійнага ўдасканалення** (перыядычнае павышэнне кваліфікацыі работнікаў СМІ, а таксама атрыманне спецыяльнай адукацыі журналістамі-практыкамі, якія маюць іншыя спецыяльнасці, але працуюць у друку).

У Інстытут журналістыкі ў парадку пераводу могуць залічвацца студэнты іншых навучальных устаноў рэспублікі, схільныя да публіцыстычнай творчасці.

Арганічна ўваходзячы ў сістэму СМІ рэспублікі, Інстытут журналістыкі наладжвае пастаянныя і трывалыя кантакты з рэдакцыямі газет, часопісаў, тэлерадыёкампаніямі, па ўзгодненасці з імі вар'іруе формы і змест вытворчай практыкі студэнтаў. Магчыма стварэнне навучальна-вытворчых аб'яднанняў "Факультэт ІЖ — рэдакцыя газеты, часопіса (тэле-, радыёпраграма)".

Структурным падраздзяленнем Інстытута журналістыкі становіцца Навукова-даследчы цэнтр (вывучэнне функцыяніравання СМІ, сацыялагічныя даследаванні чытацкай і радыётэлевізійнай аўдыторый).

Прадугледжваецца падрыхтоўка ў Акадэміі мастацтваў Беларусі рэжысёраў, гукарэжысёраў, аператараў для тэлебачання і радыё.

❑ ❑ ❑

Канцэпцыя распрацавана з улікам прагрэсіўных традыцый, назапашаных сродкамі масавай інфармацыі, новага вопыту, здабытага імі ў сучасных умовах, а таксама практыкі арганізацыі і функцыяніравання СМІ ў замежных краінах.

Творчы калектыў:
Алесь АКУЛІК, Уладзімір ГУЛЕВІЧ, Уладзімір ЛАМЕКА, Барыс СТРАЛЬЦОЎ (кіраўнік), Вячаслаў ХАРЫТОНАЎ, Ніна ЧАЙКА.

Мнение о проекте Конституции

Не пора ли очнуться и взяться самим за ум и за дело?

Георгий САЗАНОВИЧ

Какова Конституция — таковы и права, какие права — такая и жизнь. Вот почему внимательно читал проект Конституции, опубликованный в "Народной газете" 3 декабря 1991 года, а после — все новые варианты. Следил также за полемикой о Конституции в газетах. Вывод такой: идет, считаю, вульгарная, неприкрыто циничная игра с народом и хитрая спекуляция на его доверчивости и простоте. Почему? Потому, что проект новой, которой уже по счету Конституции, как и все прежние, не отдает власти народу и даже близко не подпускает его к самоуправлению.

Жизнь людей многих групп сегодня на грани, ибо всему есть предел. Дилемма проста: или верхний эшелон с народом, или против него. Третьего не дано. Но не был бы на то бюрократ. Именно в тексте Конституции он и пытается проложить себе этот третий путь: по форме — с народом, по делу — против него. Пора понять это всем избирателям, всем честным людям родной Беларуси и твердо сказать свое слово на референдуме, а потом не спеша подбирать достойных и грамотных крестьян и рабочих, учителей и врачей, инженеров, экономистов в Советы. И если во всех Советах — от сельского до Верховного — мы сможем обеспечить 80 процентов крестьян и рабочих и 15—20 процентов интеллектуалов, то без болтовни и вечных шатаний, безусловно и быстро — за 2—3 года — решим три основные задачи: 1) наведем порядок в стране, 2) сбросим рабские путы и раскрепостим творческую инициативу и предприимчивость честных и трудолюбивых людей, что позволит нам вытянуть из болота и поставить на твердую почву экономику; 3) накормим и успокоим тех, кто хочет работать, чтобы нормально жить.

Что касается замечаний по Конституции, то они есть, начиная с преамбулы и по большинству основных статей.

В ст. 1 читаем:"Республика обладает верховенством и полнотой власти на своей территории..." Но властью не обладают виды госаппарата, а конкретные органы власти, избранные народом. Народ избирает не республику, а парламент, сельский Совет, народный суд и т.д. Поэтому так надо и писать:"Избранная народом власть в лице парламента и местных Советов (или просто — избранный народом парламент) обладает верховенством и полнотой управления на своей территории..." и т.д.

Понятийная путаница вносит диссонанс во многие статьи проекта. Или читаем тут же, на мой взгляд, фарисейскую, чисто пропагандистскую и декларативную фразу о якобы защите нас с вами:"Республика (видимо, авторам думалось — государство) защищает свою независимость, целостность" и т.д. Опять же, не государство в целом, а вид, признак власти защищает свою независимость. Короче, бюрократия как форма власти защищает самое себя. Нужны ли народу эти обещания? Он ведь знает, кого и как защищает вообще государство, а тем более номенклатурно-бюрократическая "республика", ибо во все века не столько государственная машина, сколько сам народ защищал и отстаивал свою страну, если даже и не сидел вместе с армией в окопах, зато кормил, одевал и вооружал ее из последних сил. Поэтому в Конституциях нужны народу не обещания, а грамотные и твердые гарантии защиты и сохранения его жизни и будущего его детей. Государство должно и обязано не доводить дело до вооруженной защиты, ибо это уже кровь и горе народа, который вовсе не для этого кормит полчища дипломатов, политиков, генералов и прочих интеллектуалов. Поэтому вместо безграмотных и пустопорожних сентенций типа "республика защищает" в Конституции надо без лукавства, коротко и ясно, если это действительно народное государство и такая же Конституция, записать, что "избранная народом власть в лице демократического государства — Советов — своей разумной и гибкой, дальновидной и взвешенной внешней и внутренней политикой гарантирует народу его право на жизнь и защиту здоровья, охрану независимости и территориальной целостности страны, незыблемость конституционного строя, законности и правопорядка".

Читаем ст.2:"Республика Беларусь признает человека высшей ценностью общества и государства". Тысячи лет назад еще древние цивилизации признали человека главной и высшей ценностью общества и природы, и признания в этом сегодня, тем более со стороны республики, а не Конституции — это, как мне кажется, мелкое одолжение и ребячество. Признать факт величия и ценности человека должно не государство, не облаченные властью чиновники, а сама Конституция, и тогда она подчинит и государство, и общество, и отдельных граждан — всех и вся — защите и сбережению этих высших ценностей — человека, его здоровья и жизни . Но об этом так надо и говорить.

В ст.4 опять, считаю, небескорыстно путают сено с соломой, а демократию с политическими свободами. "Идеологии, мнения и политические институты" — это лишь малая кроха такого всеобъемлющего понятия, как демократия, т.е. власть народа. Поэтому демократия осуществляется не на основе "мнений и идеологий", а на основе свободного волеизъявления народа и реального, беспрепятственного участия граждан в управлении государством путем открытой и гласной выборности снизу доверху всех государственных органов и структур производственного, общественного и государственного самоуправления и всех до единого должностных лиц. Именно в этом суть демократии. Если чиновник не избран народом, а назначен друзьями, это уже не демократия, а диктат.

Вторую часть ст.24 следовало бы изложить так:"Никакие лица, государственные, общественные и политические организации, социальные слои и профессиональные группы населения не могут пользоваться преимуществами" и т.д. Если ст.31 оставить без изменений, то государство мы превратим в проходной двор. Если отрекся от Родины, то вопрос о возвращении блудного сына может быть рассмотрен лишь через 10 лет и не для всех решен. А покидать страну и беспрепятственно возвращаться можно лишь в связи с трудовым контрактом сроком до 5 лет. Ст.46 разрешает платное и бесплатное медобслуживание в государственных медучреждениях. Это, по-моему, сознательно узаконенный грабеж налогоплательщика, издевательство над больными и лазейка для спекуляции государственными, т.е. народными, лекарствами и медоборудованием. Медобслуживание может быть или государственным, т.е. бюджетным, или частным — платным. Также и обучение в вузах должно быть платным, а особо талантливая, но бедная молодежь должна проявить себя на производстве, которое обязано поддержать талант, оплатив его учебу (ст. 50).

Что касается раздела об избирательной системе, то она должна быть изменена полностью, и чем быстрее, тем лучше. Это разговор особый, но суть его в том, что должен доминировать принцип выборности всех государственных органов и должностных лиц. И выборы должны быть ступенчатыми, когда каждый избирает то должностное и государственное лицо, с которым имеет дело в повседневных заботах. Слесарю не обязательно избирать министра, а вот бригадира, начальника цеха и директора — необходимо. Всем нам не обязательно избирать Верховный Совет, а вот сельский и районный Совет (в городах с районным делением) — необходимо. И лишь президент и его заместитель (вице-президент) избираются всенародно.

"Общество, — говорил Сен-Симон, — имеет двух врагов, которых оно в равной степени боится и ненавидит. Это анархия и деспотизм". Сегодня налицо ярко выраженная форма анархии, но мы все чего-то ждем и неумолимо скатываемся к деспотизму (диктатуре), потому что "ожидание чуда, — по мысли Бердяева, — есть одна из слабостей русского народа, один из самых больших его соблазнов". Сегодня этот соблазн, это ожидание чуда, эта слабость народной души парализует волю народа и губит, отнимает его завтрашний день, ибо у ждущего, но не действующего нет будущего. 300 лет ждали чуда от Романовых, 75 лет — от большевиков, 7 лет — от "демократов". Не пора ли очнуться и взяться самим за ум и за дело?

Народная газета

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

Унесці змяненні і дапаўненні ў Закон Рэспублікі Беларусь "Аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., №12, арт. 203):

1. У частцы другой артыкула 1 словы "рэспубліканскага бюджэту" замяніць словамі "рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў".

2. Артыкул 5 пасля часткі чацвёртай дапоўніць новай часткай наступнага зместу:

"Старшыня Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь:

уносіць прадстаўленні кіраўнікам органаў дзяржаўнай улады і кіравання, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый аб прывядзенні іх рашэнняў у адпаведнасць з дзеючым заканадаўствам, а таксама аб прыцягненні да адказнасці службовых асоб, якія сваімі дзеяннямі парушылі патрабаванні заканадаўства і прычынілі дзяржаве ўрон;

прадстаўляе Кантрольную палату Рэспублікі Беларусь у дзяржаўных і іншых органах, у тым ліку ў міжнародных кантрольных арганізацыях;

заключае дагаворы і пагадненні па пытаннях фінансава-эканамічнага кантролю з кантрольна-фінансавымі органамі іншых дзяржаў і міжнароднымі кантрольна-фінансавымі арганізацыямі;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, звязаныя з дзяржаўным фінансава-эканамічным кантролем у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь".

Частку пятую лічыць часткай шостай.

3. У артыкуле 6:

частку чацвёртую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Савет Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь мае права:

рабіць грашовыя налічэнні на службовых асоб у размеры нанесенага імі дзяржаве ўрону, але не больш сумы іх трохмесячнага службовага акладу;

прымаць абавязковыя для выканання органамі дзяржаўнага кіравання, дзяржаўнымі прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі рашэнні аб ліквідацыі выяўленых недахопаў і абавязковыя для разгляду рашэнні аб прыцягненні да адказнасці службовых асоб міністэрстваў, ведамстваў, дзяржаўных прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, якія парушылі законы Рэспублікі Беларусь і прычынілі ўрон дзяржаве;

у выпадках, калі ўстаноўлены парушэнні законаў Рэспублікі Беларусь і прычынены ўрон дзяржаве службовымі асобамі, якія выбіраюцца або вызначаюцца на пасады Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў, уносіць адпаведным органам прапановы аб прыцягненні гэтых асоб да адказнасці;

у выпадку выкарыстання не па прызначэнню цэнтралізавана выдзеленых дзяржаўных рэсурсаў накладаць на суб'екты гаспадарання штраф у размеры кошту гэтых рэсурсаў;

пры выкарыстанні бюджэтных сродкаў органамі кіравання, установамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі незалежна ад форм уласнасці не ў адпаведнасці з мэтамі, на якія яны выдзелены, здымаць гэтыя сумы ў даход бюджэту і накладаць штраф у размеры гэтых сродкаў;

за нанясенне ўрону дзяржаве ў выніку ўчынення дзяржаўнымі прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі незаконных фінансава-гаспадарчых здзелак з іншымі гаспадарчымі суб'ектамі накладаць на гэтыя прадпрыемствы, установы і арганізацыі штраф у размеры кошту гэтага ўрону;

даваць прадпісанні аб прыпыненні аперацый па разліковых і іншых рахунках у банках і іншых фінансава-крэдытных установах у выпадках: непрадстаўлення або адмовы прадставіць службовым асобам Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь бухгалтарскія справаздачы і балансы, разлікі, дэкларацыі і іншыя дакументы, звязаныя з налічэннем і аплатай падаткаў, іншых абавязковых плацяжоў у бюджэт, устанаўлення фактаў утойвання прыбытку (даходу) або іншых аб'ектаў падаткаабкладання, адсутнасці дакументаў аб рэгістрацыі ці перарэгістрацыі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

уносіць пры наяўнасці законных падстаў прапановы, абавязковыя для разгляду органамі дзяржаўнага кіравання, аб ліквідацыі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый";

дапоўніць артыкул часткай пятай наступнага зместу:

"Пры недастачах, крадзяжах, наўмысным знішчэнні або псаванні таварна-матэрыяльных каштоўнасцей і іншай дзяржаўнай маёмасці ўрон пакрываецца зыходзячы з цэн, якія склаліся на дзень яго выяўлення, а на таварна-матэрыяльныя каштоўнасці, на якія ўстанаўліваюцца рэгулюемыя цэны, ён вызначаецца зыходзячы з цэн, павялічаных на суму датацый".

4. У артыкуле 7:

у пункце пятым замест слоў "Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь, Банкам знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь" запісаць слова "банкамі";

пункт сёмы выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"7) ажыццяўляе кантроль за станам кантрольна-рэвізійнай работы ў органах дзяржаўнага кіравання";

у пункце восьмым замест слоў "з рэспубліканскага бюджэту" запісаць словы "за кошт сродкаў бюджэту";

дапоўніць гэты артыкул пунктам дзесятым наступнага зместу:

"10) кантралюе знешнеэканамічную дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання, законнасць і эфектыўнасць выкарыстання дзяржаўных сродкаў пры ажыццяўленні знешнегандлёвых аперацый, стварэнні і арганізацыі дзейнасці сумесных прадпрыемстваў, прыцягненні замежных інвестыцый на развіццё эканомікі рэспублікі".

5. У артыкуле 8:

пункт 1 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"1) пры выяўленні неадпаведнасці актаў органаў дзяржаўнай улады і кіравання заканадаўству, якое рэгулюе адносіны дзяржаўнай уласнасці, гаспадарчыя, фінансавыя і падатковыя адносіны, уваходзіць з абавязковымі для разгляду прапановамі ў орган, што прыняў акт, або ў вышэйстаячы ў адносінах да яго орган";

пункт дзевяты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"9) кантраляваць і каардынаваць дзейнасць кантрольных органаў, якія ажыццяўляюць фінансава-эканамічны кантроль у народнай гаспадарцы";

дапоўніць артыкул пунктамі дзесятым і адзінаццатым наступнага зместу:

"10) даваць прадпісанні банкаўскім і фінансавым органам, дзяржаўным падатковым інспекцыям аб спагнанні плацяжоў у бюджэт, выяўленых праверкамі, а таксама штрафаў, якія накладаюцца Кантрольнай палатай Рэспублікі Беларусь на органы кіравання, прадпрыемствы, установы, арганізацыі;

11) узаемадзейнічаць у межах сваёй кампетэнцыі з адпаведнымі пастаяннымі камісіямі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Вярхоўным судом Рэспублікі Беларусь, Вышэйшым гаспадарчым судом Рэспублікі Беларусь, Пракуратурай Рэспублікі Беларусь, Камітэтам дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і іншымі органамі".

6. У артыкуле 9:

дапоўніць артыкул пунктам пятым наступнага зместу:

"5) уносіць службовым асобам прадпісанні аб ліквідацыі парушэнняў дзяржаўнай і фінансава-гаспадарчай дысцыпліны";

дапоўніць артыкул часткамі другой, трэцяй і чацвёртай наступнага зместу:

"За невыкананне законных патрабаванняў работніка Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь пры выкананні ім сваіх службовых абавязкаў, якое праявілася ў адмове прадставіць бухгалтарскія справаздачы і іншыя дакументы, на службовых асоб прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый могуць накладацца адміністрацыйныя штрафы ў размеры да трох мінімальных месячных заработных плат.

Пратаколы аб парушэннях, прадугледжаных часткай другой гэтага артыкула, складаюцца ўпаўнаважанымі работнікамі Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь.

Справы аб такіх парушэннях разглядаюцца начальнікамі ўпраўленняў, інспекцый Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь або іх намеснікамі".

7. Артыкул 10 дапоўніць часткай другой наступнага зместу:

"Служачыя Кантрольнай палаты павінны прыпыніць сваё членства ў любой палітычнай партыі, грамадскіх аб'яднаннях, якія маюць палітычныя мэты".

8. Артыкул 12 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Артыкул 12. Парадак абскарджання рашэнняў Савета Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь і рашэнняў яе службовых асоб

Рашэнні Савета Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь і рашэнні яе службовых асоб могуць быць абскарджаны ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку".

9. Дапоўніць Закон артыкулам 8^1 наступнага зместу:

"Артыкул 8^1. Інспекцыя Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь. Парадак утварэння і яе паўнамоцтвы

Інспекцыя Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь утвараецца Саветам Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь.

Інспекцыю ўзначальвае начальнік інспекцыі, які назначаецца старшынёй Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь. Начальнік інспекцыі мае намесніка, які назначаецца старшынёй Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь.

Інспекцыя ажыццяўляе сваю дзейнасць на тэрыторыі вобласці, горада ў адпаведнасці з гэтым Законам.

Начальнік інспекцыі мае права рабіць грашовыя налічэнні на службовых асоб у размеры нанесенага імі дзяржаве ўрону, але не больш сумы іх месячнага службовага акладу".

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

28 студзеня 1993 г.
г.Мінск. № 2135-XII

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь" з 1 лютага 1993 года.

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 сакавіка 1993 года прадставіць у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы аб прывядзенні дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь".

3. Лічыць страціўшым сілу пункт трэці пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 13 сакавіка 1992 года "Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., №12, арт. 204).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

28 студзеня 1993 г.
г.Мінск. № 2136-XII

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь

(Са змяненнямі і дапаўненнямі, унесенымі Законам Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 1993 г.)

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Статус Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь

Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь — вышэйшы орган фінансава-эканамічнага кантролю ў рэспубліцы, які ўтвараецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і дзейнічае пад яго кіраўніцтвам.

Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе кантроль за выкананнем рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, за выкарыстаннем дзяржаўнай уласнасці; кантралюе выкананне законаў Рэспублікі Беларусь, пастаноў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і адпаведнасць ім іншых актаў, якія рэгулююць адносіны дзяржаўнай уласнасці, гаспадарчыя, фінансавыя і падатковыя адносіны.

Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь з'яўляецца юрыдычнай асобай і мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і са сваёй назвай.

Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь валодае правам заканадаўчай ініцыятывы.

Артыкул 2. Прававыя асновы дзейнасці Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь

Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь дзейнічае ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі рэспублікі.

Артыкул 3. Сродкі на ўтрыманне Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь

Сродкі на ўтрыманне Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь, а таксама на аплату прыцягнутых спецыялістаў і рэвізораў выдзяляюцца непасрэдна з рэспубліканскага бюджэту. Размер гэтых сродкаў штогод устанаўліваецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь пры зацвярджэнні рэспубліканскага бюджэту.

Структура, штатная колькасць і фонд аплаты працы работнікаў Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь зацвярджаюцца яе старшынёй у межах устаноўленых асігнаванняў.

II. СКЛАД, ПАРАДАК УТВАРЭННЯ І АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ КАНТРОЛЬНАЙ ПАЛАТЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Артыкул 4. Склад Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь

Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь складаецца са старшыні Кантрольнай палаты, першага намесніка старшыні, намеснікаў старшыні, а таксама ўпраўленняў, аддзелаў і інспекцый.

Артыкул 5. Старшыня Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь

Старшыня Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь выбіраецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь тэрмінам на 5 гадоў і не можа займаць гэту пасаду больш двух тэрмінаў запар.

Старшыня Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь можа быць датэрмінова вызвалены ад пасады рашэннем Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у выпадку нездавальняючага выканання сваіх службовых абавязкаў, парушэння заканадаўства або ўчынення злоўжыванняў па службе.

Старшыня Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь прадстаўляе кандыдатуры на пасады першага намесніка і намеснікаў старшыні Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь для зацвярджэння іх Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

У сваёй дзейнасці старшыня Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь кіруецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і ў межах сваёй кампетэнцыі самастойна вырашае ўсе пытанні, звязаныя з ажыццяўленнем кантролю, планаваннем, правядзеннем праверак, рэвізій і абследаванняў, назначэннем службовых асоб, забяспечвае камплектаванне Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь кампетэнтнымі спецыялістамі адпаведнага профілю.

Старшыня Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь:

уносіць прадстаўленні кіраўнікам органаў дзяржаўнай улады і кіравання, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый аб прывядзенні іх рашэнняў у адпаведнасць з дзеючым заканадаўствам, а таксама аб прыцягненні да адказнасці службовых асоб, якія сваімі дзеяннямі парушылі патрабаванні заканадаўства і прычынілі дзяржаве ўрон;

прадстаўляе Кантрольную палату Рэспублікі Беларусь у дзяржаўных і іншых органах, у тым ліку ў міжнародных кантрольных арганізацыях;

заключае дагаворы і пагадненні па пытаннях фінансава-эканамічнага кантролю з кантрольна-фінансавымі органамі іншых дзяржаў і міжнароднымі кантрольна-фінансавымі арганізацыямі;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, звязаныя з дзяржаўным фінансава-эканамічным кантролем, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь мае права ўдзельнічаць у пасяджэннях Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, яго Прэзідыума і ўрада Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 6. Савет Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь

Для абмеркавання пытанняў планавання і арганізацыі работы, метадалогіі кантрольнай дзейнасці, падрыхтоўкі справаздач і інфармацый Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь, яго Прэзідыуму ўтвараецца савет Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь.

У склад савета Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь уваходзяць па пасадзе: старшыня палаты, яго намеснікі, начальнікі ўпраўленняў. Савет Кантрольнай палаты зацвярджаецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

У выпадку выяўлення пры правядзенні праверак і рэвізій фактаў злоўжыванняў савет Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь накіроўвае адпаведныя матэрыялы ў праваахоўныя органы або ставіць пытанне перад уласнікамі прадпрыемстваў аб прыцягненні да адказнасці службовых асоб.

Савет Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь мае права:

рабіць грашовыя налічэнні на службовых асоб у размеры нанесенага імі дзяржаве ўрону, але не больш сумы іх трохмесячнага службовага акладу;

прымаць абавязковыя для выканання органамі дзяржаўнага кіравання, дзяржаўнымі прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі рашэнні аб ліквідацыі выяўленых недахопаў і абавязковыя для разгляду рашэнні аб прыцягненні да адказнасці службовых асоб міністэрстваў, ведамстваў, дзяржаўных прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, якія парушылі законы Рэспублікі Беларусь і прычынілі ўрон дзяржаве;

у выпадках, калі ўстаноўлены парушэнні законаў Рэспублікі Беларусь і прычынены ўрон дзяржаве службовымі асобамі, якія выбіраюцца або назначаюцца на пасады Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў, уносіць адпаведным органам прапановы аб прыцягненні гэтых асоб да адказнасці;

у выпадку выкарыстання не па прызначэнню цэнтралізавана выдзеленых дзяржаўных рэсурсаў накладаць на суб'екты гаспадарання штраф у размеры кошту гэтых рэсурсаў;

пры выкарыстанні бюджэтных сродкаў органамі кіравання, установамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі незалежна ад форм уласнасці не ў адпаведнасці з мэтамі, на якія яны выдзелены, здымаць гэтыя сумы ў даход бюджэту і накладаць штраф у размеры гэтых сродкаў;

за нанясенне ўрону дзяржаве ў выніку ўчынення дзяржаўнымі прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі незаконных фінансава-гаспадарчых здзелак з іншымі гаспадарчымі суб'ектамі накладаць на гэтыя прадпрыемствы, установы і арганізацыі штраф у размеры кошту гэтага ўрону;

даваць прадпісанні аб прыпыненні аперацый па разліковых і іншых рахунках у банках і іншых фінансава-крэдытных установах у выпадках: непрадстаўлення або адмовы прадставіць службовым асобам Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь бухгалтарскія справаздачы і балансы, разлікі, дэкларацыі і іншыя дакументы, звязаныя з налічэннем і аплатай падаткаў, іншых абавязковых плацяжоў у бюджэт, устанаўлення фактаў утойвання прыбытку (даходу) або іншых аб'ектаў падаткаабкладання, адсутнасці дакументаў аб рэгістрацыі ці перарэгістрацыі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

уносіць пры наяўнасці законных падстаў прапановы, абавязковыя для разгляду органамі дзяржаўнага кіравання, аб ліквідацыі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.

Пры недастачах, крадзяжах, наўмысным знішчэнні або псаванні таварна-матэрыяльных каштоўнасцей і іншай дзяржаўнай маёмасці ўрон пакрываецца зыходзячы з цэн, якія склаліся на дзень яго выяўлення, а на таварна-матэрыяльныя каштоўнасці, на якія ўстанаўліваюцца рэгулюемыя цэны, ён вызначаецца зыходзячы з цэн, павялічаных на суму датацый.

III. ФУНКЦЫІ І ПАЎНАМОЦТВЫ КАНТРОЛЬНАЙ ПАЛАТЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Артыкул 7. Функцыі Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь

Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь:

1) кантралюе выкананне законаў Рэспублікі Беларусь, пастаноў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і адпаведнасць ім іншых актаў, якія рэгулююць адносіны дзяржаўнай уласнасці, гаспадарчыя, фінансавыя і падатковыя адносіны;

2) ажыццяўляе кантроль за своечасовасцю і паўнатой паступлення даходаў, мэтавым і эканомным расходаваннем сродкаў рэспубліканскага бюджэту, пазабюджэтных дзяржаўных фондаў; за расходамі на ўтрыманне органаў дзяржаўнай улады і кіравання, захаванасцю і выкарыстаннем дзяржаўнай маёмасці ў галінах народнай гаспадаркі, уключаючы абаронную прамысловасць, а таксама ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, у сістэме Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, органаў суда, пракуратуры і мытні; за раздзяржаўленнем і прыватызацыяй аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці; ажыццяўляе кантроль за расходаваннем сродкаў, якія выдзяляюцца з дзяржаўнага бюджэту на выкананне дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм;

3) кантралюе работу Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь і яго органаў па выкананню рэспубліканскага бюджэту;

4) кантралюе інвестыцыйную дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь; правярае законнасць і эфектыўнасць выкарыстання дзяржаўных рэсурсаў усімі дзяржаўнымі арганізацыямі і прадпрыемствамі, а таксама выкарыстанне матэрыяльных і грашовых сродкаў, якія накіроўваюцца дзяржавай на стварэнне і развіццё прадпрыемстваў недзяржаўных форм уласнасці;

5) ажыццяўляе кантроль за эмісійнай палітыкай, выкарыстаннем крэдытаў і валютных рэсурсаў выканаўчымі і распарадчымі органамі Рэспублікі Беларусь, банкамі;

6) па даручэнню Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і яго Прэзідыума праводзіць экспертную ацэнку артыкулаў праектаў рэспубліканскага бюджэту, фінансава-эканамічнай абгрунтаванасці праектаў дзяржаўных праграм і ўрадавых рашэнняў; праводзіць аналіз эканамічнага становішча ў галінах народнай гаспадаркі, стану цэнаўтварэння і ў межах сваёй кампетэнцыі выконвае іншыя заданні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і яго Прэзідыума;

7) ажыццяўляе кантроль за станам кантрольна-рэвізійнай работы ў органах дзяржаўнага кіравання;

8) правярае фінансава-гаспадарчую дзейнасць дзяржаўных арганізацый, прадстаўніцтваў і ўстаноў, якія дзейнічаюць за мяжой і фінансуюцца за кошт сродкаў бюджэту;

9) ажыццяўляе сувязі з кантрольнымі органамі замежных краін і адпаведнымі міжнароднымі арганізацыямі, заключае з імі пагадненні аб дзелавым супрацоўніцтве;

10) кантралюе знешнеэканамічную дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання, законнасць і эфектыўнасць выкарыстання дзяржаўных сродкаў пры ажыццяўленні знешнегандлёвых аперацый, стварэнні і арганізацыі дзейнасці сумесных прадпрыемстваў, прыцягненні замежных інвестыцый на развіццё эканомікі рэспублікі.

Артыкул 8. Паўнамоцтвы Кантрольнай палаты

Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь пры ажыццяўленні сваіх функцый мае права:

1) пры выяўленні неадпаведнасці актаў органаў дзяржаўнай улады і кіравання заканадаўству, якое рэгулюе адносіны дзяржаўнай уласнасці, гаспадарчыя, фінансавыя і падатковыя адносіны, уваходзіць з абавязковымі для разгляду прапановамі ў орган, што прыняў акт, або ў вышэйстаячы ў адносінах да яго орган;

2) праводзіць фінансавыя рэвізіі ў апараце вышэйшых і мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання, праверкі, рэвізіі і абследаванні ў міністэрствах, ведамствах, установах, арганізацыях, на дзяржаўных прадпрыемствах;

3) атрымліваць ад дзяржаўных, камерцыйных банкаў і іншых крэдытных устаноў неабходныя для правядзення праверак звесткі аб аперацыях і стане рахункаў аб'ектаў, якія правяраюцца, а ад іншых прадпрыемстваў і арганізацый — даведкі і копіі дакументаў па аперацыях і разліках з гэтымі аб'ектамі;

4) прыцягваць да правядзення праверак, рэвізій і экспертыз кваліфікаваных спецыялістаў з іншых устаноў і арганізацый, а таксама работнікаў іншых кантрольных і праваахоўных органаў з аплатай у неабходных выпадках за кошт сродкаў Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь;

5) у межах сваёй кампетэнцыі даваць адміністрацыі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, якія правяраюцца, абавязковыя для выканання ўказанні аб ліквідацыі ва ўстаноўленыя тэрміны выяўленых парушэнняў і вяртанні ў бюджэт недаплачаных сум;

6) накіроўваць матэрыялы праверак і рэвізій у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, міністэрствы, дзяржаўныя камітэты, ведамствы Рэспублікі Беларусь і іншыя органы дзяржаўнага кіравання для разгляду і прыняцця па іх неабходных мер;

7) уносіць у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, а таксама ў іншыя дзяржаўныя органы прадстаўленні аб прыцягненні да адказнасці службовых асоб, вінаватых у парушэннях патрабаванняў заканадаўства, безгаспадарчасці, прычыненні матэрыяльнага ўрону дзяржаве;

8) у выпадках выяўлення пры правядзенні праверак і рэвізій фактаў крадзяжоў грашовых сродкаў і матэрыяльных каштоўнасцей, іншых злоўжыванняў перадаваць матэрыялы праверак і рэвізій у праваахоўныя органы;

9) кантраляваць і каардынаваць дзейнасць кантрольных органаў, якія ажыццяўляюць фінансава-эканамічны кантроль у народнай гаспадарцы;

10) даваць прадпісанні банкаўскім і фінансавым органам, дзяржаўным падатковым інспекцыям аб спагнанні плацяжоў у бюджэт, выяўленых праверкамі, а таксама штрафаў, якія накладаюцца Кантрольнай палатай Рэспублікі Беларусь на органы кіравання, прадпрыемствы, установы, арганізацыі;

11) узаемадзейнічаць у межах сваёй кампетэнцыі з адпаведнымі пастаяннымі камісіямі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Вярхоўным судом Рэспублікі Беларусь, Вышэйшым гаспадарчым судом Рэспублікі Беларусь, Пракуратурай Рэспублікі Беларусь, Камітэтам дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і іншымі органамі.

Артыкул 8^1. Інспекцыя Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь. Парадак утварэння і яе паўнамоцтвы

Інспекцыя Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь утвараецца саветам Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь.

Інспекцыю ўзначальвае начальнік інспекцыі, які назначаецца старшынёй Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь. Начальнік інспекцыі мае намесніка, які назначаецца старшынёй Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь.

Інспекцыя ажыццяўляе сваю дзейнасць на тэрыторыі вобласці, горада ў адпаведнасці з гэтым Законам.

Начальнік інспекцыі мае права рабіць грашовыя налічэнні на службовых асоб у размеры нанесенага імі дзяржаве ўрону, але не больш сумы іх месячнага службовага акладу.

Артыкул 9. Паўнамоцтвы службовых асоб Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь

Службовыя асобы Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь пры выкананні сваіх службовых абавязкаў маюць права:

1) знаёміцца ў поўным аб'ёме з усёй дакументацыяй, якая патрабуецца пры правядзенні праверак, рэвізій і абследаванняў;

2) беспярашкоднага доступу на склады, у сховішчы, вытворчыя і дапаможныя памяшканні і іншыя аб'екты для праверкі наяўнасці грашовых сродкаў, каштоўных папер, матэрыяльных каштоўнасцей і парадку іх захоўвання;

3) атрымліваць ад службовых асоб і іншых работнікаў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый неабходныя даведкі, вусныя і пісьмовыя тлумачэнні па пытаннях, звязаных з правядзеннем праверак або рэвізій;

4) у неабходных выпадках апячатваць касы або касавыя памяшканні, склады, архівы, а пры выяўленні падробак, падлогаў і іншых злоўжыванняў забіраць неабходныя дакументы, пакідаючы ў справах акт адабрання і копіі або вопіс забраных дакументаў;

5) уносіць службовым асобам прадпісанні аб ліквідацыі парушэнняў дзяржаўнай і фінансава-гаспадарчай дысцыпліны.

За невыкананне законных патрабаванняў работніка Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь пры выкананні ім сваіх службовых абавязкаў, якое праявілася ў адмове прадставіць бухгалтарскія справаздачы і іншыя дакументы, на службовых асоб прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый могуць накладацца адміністрацыйныя штрафы ў размеры да трох мінімальных месячных заработных плат.

Пратаколы аб парушэннях, прадугледжаных часткай другой гэтага артыкула, складаюцца ўпаўнаважанымі работнікамі Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь.

Справы аб такіх парушэннях разглядаюцца начальнікамі ўпраўленняў, інспекцый Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь або іх намеснікамі.

Артыкул 10. Адказнасць службовых асоб Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь

Службовыя асобы Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь абавязаны добрасумленна выконваць свой службовы абавязак, абараняць дзяржаўныя, агульнанародныя інтарэсы. У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам яны нясуць адказнасць за скажэнне вынікаў праводзімых праверак, якія прадстаўляюцца ў дзяржаўныя органы, і за дакладнасць інфармацыі, што даводзіцца да агульнага ведама, а таксама за выдаванне камерцыйнай тайны прадпрыемстваў, арганізацый і аб'яднанняў, якія правяраюцца.

Служачыя Кантрольнай палаты павінны прыпыніць сваё членства ў любой палітычнай партыі, грамадскіх аб'яднаннях, якія маюць палітычныя мэты.

Артыкул 11. Абавязак органаў дзяржаўнай улады і кіравання садзейнічаць службовым асобам Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь у выкананні ўскладзеных на іх функцый

Органы дзяржаўнай улады і кіравання абавязаны ўсямерна садзейнічаць службовым асобам Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь у выкананні ўскладзеных на іх функцый, аказваць ім неабходную дапамогу ў правядзенні праверак і рэвізій, забяспечваць іх жылымі і службовымі памяшканнямі, транспартам, сродкамі сувязі.

Службовыя асобы, якія перашкаджаюць чым-небудзь правядзенню праверак і рэвізій і не забяспечваюць неабходных умоў для работы супрацоўнікам Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь, а таксама не выконваюць абавязковых указанняў Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь, нясуць адказнасць ва ўстаноўленым законам парадку. Службовыя асобы абавязаны далажыць Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь аб ліквідацыі выяўленых парушэнняў.

Артыкул 12. Парадак абскарджання рашэнняў савета Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь і рашэнняў яе службовых асоб

Рашэнні савета Кантрольнай палаты Рэспублікі Беларусь і рашэнні яе службовых асоб могуць быць абскарджаны ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

13 сакавіка 1993 года.
г.Мінск.
№ 1522-XII

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

ЗАМЕЖЖА
ІТАР-ТАСС • НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Пульс дня

Ельцын адмяніў свой візіт

Барыс Ельцын змяніў раней прынятае рашэнне і адмяніў свой намечаны на май візіт у Японію.

Па гэтаму пытанню вядуцца перагаворы ў Маскве з прадстаўніком Японіі, паведаміў карэспандэнту ІТАР—ТАСС кіраўнік прэс-службы прэзідэнта РФ Анатоль Красікаў.

ААН не прызнае незалежнасць Карабаха

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый не прызнае незалежнасць Нагорнага Карабаха без згоды Арменіі і Азербайджана.

Аб гэтым заявіў Генеральны сакратар ААН Бутрас Галі, выступаючы ў праграме тэлекампаніі Сі-эн-эн.

Ізраіль прытрымліваецца ранейшых пазіцый

Ізраіль працягвае прытрымлівацца ранейшай жорсткай пазіцыі па асноўных праблемах, абмяркоўваемых у ходзе мірных двухбаковых перагавораў у Вашынгтоне, у тым ліку адносна рэзалюцыі 242 Савета Бяспекі ААН, якая асуджае набыццё чужых тэрыторый сілай і патрабуе вываду ізраільскіх войск з акупіраваных арабскіх зямель.

Аб гэтым заявіў у інтэрв'ю арабскай службе радыёкарпарацыі Бі-бі-сі кіраўнік палесцінскай дэлегацыі Хейдар Абд Аш-Шафі.

ЗША гатовы ўвесці свае войскі

Амерыканскае ваеннае камандаванне плануе размясціць некалькі тысяч ваеннаслужачых са складу сухапутных сіл ЗША на тэрыторыі Босніі і Герцагавіны ўжо на канец наступнага тыдня.

Аб гэтым паведаміла ў сераду добра інфармаваная газета "Уол-стрыт джорнэл" са спасылкай на высокапастаўленага прадстаўніка камітэта начальнікаў штабоў узброеных сіл, які прасіў не называць яго імя ў друку.

Ярузельскі выйграў працэс

Практычна не пачаўшыся, завяршыўся ў варшаўскім ваяводскім судзе працэс, да якога па абвінавачанню ў абразе асобы былы першы сакратар ЦК ПАРП, былы прэзідэнт Польшчы Войцэх Ярузельскі і яго жонка Барбара прыцягнулі былога начальніка сваёй аховы палкоўніка Артура Гатуўку.

Яны знайшлі шмат зневажальных для сябе меркаванняў у яго нядаўна выйшаўшай у Польшчы кнізе "Я быў целаахоўнікам Ярузельскага", а таксама ў шэрагу заяў і інтэрв'ю палкоўніка, зробленых ім пры выпадку прэзентацыі сваёй літаратурнай працы.

Адстаўны палкоўнік за пяць мінут да пачатку судовага пасяджэння адмовіўся ад дапамогі адваката і заявіў у судзе, што ўсе яго абвінавачванні ў адрас Ярузельскіх з'яўляюцца "няпраўдзівымі". Ён таксама выказаў імкненне прынесці прабачэнні абражаным мужу і жонцы.

Выставачны цэнтр расчыніў дзверы

Жэнеўскі выставачны цэнтр "Палэкспа" расчыніў свае дзверы для наведвальнікаў міжнароднага салона кнігі і перыядычных выданняў.

Ужо ў першы дзень яго гасцямі сталі тысячы швейцарцаў і замежных турыстаў, прадстаўнікоў прэсы і дзелавых людзей.

Пример, достойный подражания?



...Десять мальчиков и ни одной девочки!

США. Многочисленная семья Пола и Шарон Сеппала из Штата Нью-Гемпшир недавно пополнилась крошечным Роджером. Теперь это великолепная десятка бравых американских парней: Том, Энди, Рон, Кенни, Джеффри, Денни, Стефен, Скотти, Расти и самый маленький Роджер. Их мать Шарон призналась, что ее мечтой всегда было иметь десять мальчиков. "В этом мне здорово помогал мой муж Пол! За 13 лет — десять мальчиков и ни одной девочки! Видно, Бог услышал мои молитвы!"

Купите носорога...

Шесть редких черных носорогов выставляются на международный аукцион правительством Намибии. Начальная ставка предстоящих в мае торгов — один миллион долларов.

Породистые толстокожие гиганты, в том числе два самца, а также молодые слоны, антилопы, жирафы и другие представители богатой фауны континента будут предложены на продажу исключительно селекционерам и фермерам, специализирующимся на разведении диких животных. Об этом сообщил в Виндхуке постоянный секретарь по делам охраны природы и туризма Намибии Ханно Румпф.

"Мы полагаем, что фермеры могут сыграть важную роль в деле сохранения исчезающих видов фауны, — сказал он. — Эффективный контроль за процессом разведения диких животных позволит создать своеобразный резервный фонд, в том числе для зоопарков, не сокращая их популяции в национальных заповедниках".

Охота на носорогов официально запрещена международным сообществом. Прекращение легальной торговли дорогостоящими рогами породило их дефицит, что привело к повышению цен на "черном рынке". За рог африканского гиганта, из которого изготавливают средство, якобы способное тонизировать мужской организм, можно получить баснословные деньги, особенно в странах Востока. Вот и гремят в саванне выстрелы браконьеров, угрожающими темпами уменьшается популяция носорогов.

В 1989 году Намибия первой встала на путь спиливания рогов у носорогов — единственного пока реального способа сохранить для будущих поколений редчайшее на земле животное и отбить охоту у браконьеров наживать "грязные" деньги за счет их истребления. Впрочем, на месте удаленной костной ткани начинает расти новая по 6 сантиметров в год.

В ту ночь, когда окончилась война

Репортаж из Музея безоговорочной капитуляции Германии

Карлсхорст, один из районов Берлина. Небольшой, утопающий в зелени двухэтажный особняк. На пьедестале у входа — "тридцатьчетверка" с надписью "Мать-Родина" на башне. 48 лет назад здесь была поставлена последняя точка в войне...

8 мая сорок пятого. Близится полночь.

Бои прекратились уже несколько дней назад. С 30 апреля над куполом рейхстага развевается красное знамя, в тот же день Гитлер покончил жизнь самоубийством. Пала рейхсканцелярия. По приказу советского военного коменданта Берлина генерал-полковника Николая Берзарина введено продовольственное снабжение населения города. Из скромных армейских запасов на эти нужды выделено 1250 тонн мяса, 75 тонн сала, 6 тысяч тонн муки, 12 тысяч тонн картофеля, 550 тонн соли, 500 тонн сахара.

